І. В. КАЗАКОВА

# МІФАЛАГІЧНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў ВЯСЕЛЬНЫМ АБРАДЗЕ БЕЛАРУСАЎ
## (на матэрыяле Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці)

Беларускае вяселле — гэта самы ўрачысты абрад беларусаў, своеасаблівы спектакль, у якім ярка раскрываецца душа народа, яго тэмперамент і светабачанне. Вяселле ў розных раёнах Беларусі мае свае асаблівасці. Шмат старажытных рыс яго, якія захаваліся, відаць, яшчэ з язычніцкіх часоў, адзначаецца ў вёсках Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. У гэтым рэгіёне вясельны абрад складаецца з наступных этапаў: «сватоў» (або «заручын», або «бяседы»), «дзявічніка», «збораў», «вясельнага застолля ў маладой і жаніха», «продажу нявесцінага пасагу» і «цешчынага гасцінцу».

На першым этапе вяселля цесна пераплятаюцца і сучаснасць, і рэшткі старажытнай міфалагічнай свядомасці. Сваты ўваходзяць у хату і просяцца пераначаваць. Бацька нявесты прымае суровы выгляд і патрабуе ў сватоў дакументы. Сват дастае вялікі лыкавы кашэль з ежай і медавухай. Чаму менавіта лыкавы? Лыка было каштоўным матэрыялам, лічылася, што калі з лыку зрабіць рэч, у ёй пасяляецца дух ляшука (яго называюць яшчэ «лукаш» або «лыкаш»). Калі «дралі лыка» на вясельны кош, у лесе абавязкова пакідалі падарунак ляшуку — часцей за ўсё кавалак футры або воўны. Важна і тое, што знаходзіцца ў кошы. Часцей за ўсё гэта хлеб і мёд. Хлеб, як і ў многіх іншых еўрапейскіх народаў, — сімвал дабрабыту, багацця і шчасця. Мёд таксама сімвал дабрабыту, «салодкага жыцця», кахання.

Гаворка сватоў іншасказальная. Сваты пытаюць: «Ці не прыблудзілася да вас мядзведзіца?» або «нашаму бычку патрэбна спраўная цялушка (або кароўка)». У гэтых словах — рэшткі глыбокай старажытнасці. Нашы продкі лічылі магчымымі шлюбы паміж людзьмі і жывёламі (па-шведску ажаніцца — літаральна «абмядзведзіцца»). Жывёлы ў асноўным былі татэмамі, у беларусаў гэта часта воўк і мядзведзь. Мядзведзіцай нявесту ў асноўным называлі тады, калі яна была багатая. Карова ж з даўніх часоў — сімвал здароўя і пладавітасці.

На запытанне сватоў бацька нявесты адказвае: «Цялушка ёсць, але яшчэ ніяк яе не загналі дадому». Сваты гавораць, што трапілі на «збрадлівую» цёлку. Пачынаецца жартоўная спрэчка. Спачатку прыводзяць маленькую сястру нявесты або дзяўчынку-суседку. Дружкі свата спяваюць ёй «Зялёна зеляненька ў полі канапелька» і даюць дзяўчынцы зялёную галінку. Зялёныя каноплі, зялёная галінка сімвалізуюць зусім маладзенькую дзяўчынку, якой рана яшчэ замуж. Толькі пасля гэтага прыводзілі нявесту. Калі сваты згаджаліся ўзяць такую «цялушку» у сваю гаспадарку, тады бацька запрашаў іх да стала і дамаўляліся наконт вяселля. У гэты час маці нявесты ішла «ламаць каліну». Пакланіўшыся на чатыры бакі, і дрэву таксама, з адпаведнымі словамі зламвала з маладога дрэўца каліны вярхушку і аддавала яе сватам. Маладое дрэва лічылася «дзявочым талісманам», які ахоўвае ў бацькоўскай хаце дзяўчыну. У гэтым рытуале бачны рэшткі старажытнага анімізму: сувязь чалавека і дрэва. Зламванне вярхушкі рыхтавала выхад духа гэтага дрэва і перасяленне яго ў другое дрэва, якое будзе расці ля дома новай сям'і нявесты.

Пасля змовы нявесту і жаніха называлі «суджаны» і «суджаная», бо сваты, а праз іх людскі суд як бы прысуджалі іх да шлюбу. Суджаны надзяваў нявесце пярсцёнак, а яна яму на галаву свой вянок. З адной чаркі яны пілі гарэлку з мёдам: каб і горыч, і асалоду дзялілі разам. Крыху з чаркі вылівалі пад ганак — душам продкаў.

Песні ў час сватоў прысвячаліся самой падзеі або нявесце. У песнях нявеста параўноўваецца з галубіцаю, з калінай, з белай ярачкай. Цікава, чаму з ярачкай? Белая авечка — сімвал чысціні, рахманасці, сціпласці. Але, на нашу думку, магло тут адбіцца і тое, што ягня ў Бібліі — ахвяра. Сапраўды, раней маладая жанчына была ахвярай для «мужа-п'яніцы» і «лютай свякроўкі».

Калі нявеста была сірата, меў месца такі рытуал. Яна расчыняла дзверы і разлівала па хаце ваду («слёзы»), пры гэтым звярталася да сіл прыроды, каб яны паслалі «вестачку» яе памёршым бацькам пра яе вяселле. У другіх выпадках нявеста ішла на могілкі да бацькоў прасіць у іх згоды на шлюб, дзе павінна была паліць сваімі слязьмі кветкі на іх магілах.

У канцы змовы сват укладваў у руку жаніха руку нявесты (магчыма, адсюль і другая назва гэтага этапу вяселля — заручыны). Гэта значыла,

што жаніх павядзе нявесту за руку па сваёй дарозе жыцця. Суджаныя ідуць з хаты па адной палавіцы (каб заўсёды ісці па адной дарозе), абавязкова трымаючыся за рукі сыходзяць з ганку. Раней пад парогам хавалі памёршых, пазней пачалі лічыць, што тут пасяляюцца іх душы, і маладыя павінны былі ім паказаць, што яны заручыліся на шлюб. Маладыя просяць душы продкаў блаславіць іх. Калі нявеста ці жаніх падмануць адзін аднаго да вяселля, будуць трымаць перад продкамі адказ. Жаніх зводзіць нявесту з ганку: значыць ён як бы узяў абавязак вывясці яе з бацькаўскай хаты. Пасля гэтага сваты ад'язджаюць дадому.

Нявеста разам з сяброўкамі пачынае рыхтаваць сабе пасаг. Кожны дзень на нявесце павінен быць адзеты вянок з белых кветак. У апошні дзень «дзявічніка» дзяўчаты здымаюць з яе вянок, плачуць, дораць ёй палатно (сімвал дарогі), расчэсваюць касу, варожаць па валасах на добрае жыццё. Нявеста абавязкова павінна плакаць, каб выплакаць дома ўсе слёзы і не плакаць ў свякрові. Кветкамі і стужкамі нявеста прыбірала куфры і кадкі з пасагам. Таксама прыбіраліся і пні тых дрэў, якія спілілі, каб падрыхтаваць гэтыя рэчы для нявесты. Так задобрываліся духі, інакш, лічылі, новыя рэчы будуць скрыпець па начах і не даваць маладым спаць. Як бачым, і тут адчуваецца рудымент сівой старажытнасці.

Напярэдадні вяселля рабілі зборы. Сваха з боку жаніха і тры сяброўкі нявесты (шэравокія ці блакітнавокія, толькі не чарнавокія, каб не «сурочыць» нявесту) вялі яе ў лазню, якую палілі з раніцы. А да таго нявеста на ўсходзе сонца, неапранутая, купалася ў расе, каб ачысціцца ад ўсіх грахоў. На ўсколенках яна прасіла сонца блаславіць яе на шчаслівае сямейнае жыццё, паслаць ёй дзяцей, прыгажосць і каханне. Тут мы бачым рэшткі старажытнага пакланення нашых продкаў сонцу як галоўнаму богу — Сварогу. Пазней ад гэтага рытуалу засталося толькі хаджэнне нявесты босай па расе. Калі нехта падглядаў за нявестай у гэты час, на яго пасылаўся праклён. Калі гэта быў жаніх, нявесту яму не аддавалі, а жанілі яго на ўдаве. Мылі нявесту толькі дажджавой вадой (нявеста — сама чысціня, таму яе трэба мыць вадой, якая ўпала з неба. І яшчэ: нявеста — будучая маці, непарыўна яе сувязь з прыродай, з маці-зямлёй. Дождж дапамагае зямлі нарадзіць добры ўраджай, ён павінен дапамагчы нявесце нарадзіць добрых і здаровых дзетак). Часам у ваду дабаўлялі кветкі медуніцы. Пачыналі мыць нявесту з левай нагі, каб змыць усю ляноту. Апошняй мылі касу, валасы, якія выпадалі з касы, абавязкова палілі.

У дзень вяселля раніцой пачыналі прыбіраць нявесту, пасля яе хавалі ў хаце, якая стаяла на захад сонца.

Шмат старажытных рытуалаў, прыгожых і мудрых, звязана з караваем, які ва ўсіх індаеўрапейскіх народаў — ледзь не галоўны атрыбут вясельнага абраду. Інфарматары з Хоцімскага раёну прывялі такія дэталі, якія адрозніваюць рытуал, звязаны з караваем, ад іншых рэгіёнаў Беларусі. Тут яго пяклі ноччу перад вяселлем у хаце жаніха. Прысвячаўся каравай сонцу, быў круглы, як і сонца. На ім выраблялі сонца, птушак, каласы і інш. (праўда, гэта характэрна і для іншых народаў). Адметнае ў тым, што маці жаніха на прыгожым рушніку выносіла каравай на ўзгорак і з паклонам прасіла сонца блаславіць яго. Часам у каравай укладвалі грошы.

Жаніха блаславлялі хлебам, соллю, добрым словам «на шчасце, на долю». Шмат песень прысвячалі каню жаніха. Калі вясельны поезд ехаў за нявестай, ваўкам, гаспадарам лесу, кідалі мяса далей ад дарогі, каб не схапілі ўдзельнікаў свята. Па дарозе спявалі песні, прычым нявесту ў іх называлі толькі іншасказальна: «паехалі па русую касу», каб не ўкралі яе лясныя духі. Часам рабілі жартоўны шлюб старой бабы, якую выводзілі замест нявесты, і дзеда-бабыля, каб адвесці злых духаў ад маладых.

Маці нявесты, сустракаючы маладых, кідала на падлогу белы абрус: лічылася, што той, хто стане на яго першы, той будзе першы і ў сям'і. Хлопцы хавалі абутак нявесты. Тая сяброўка нявесты, якая знойдзе абутак, першая выйдзе замуж. У хаце жаніха нявеста і жаніх кідаюць грошы пад печ: нявеста — два залатых, жаніх — адзін (нявеста павінна падтрымліваць асабліва добрыя адносіны з дамавіком, бо ў яе больш спраў у хаце).

Цікавы рытуал продажу нявестай касы. Прадае яе малодшы брат (гэтым самым як бы прадаецца сама нявеста), які стаіць з сярпом і пагражае адрэзаць касу, калі дадуць малы выкуп. Жаніх, сват і дружкі выкупаюць таксама пасаг нявесты.

У каморы, дзе стаіць ложак маладых, шмат кошаў з зернем, што сімвалізуе ўрадлівасць зямлі, якая павінна пераносіцца на пладавітасць жанчы-

ны. Пад ложак садзяць кошку з кацянятамі, каб было многа дзяцей. Часам маладым дораць пеўня ў мяшку. Певень таксама сімвал пладавітасці, акрамя таго, ён адганяе злых духаў і павінен сваімі спевамі рана падняць маладую, каб яна памыла слязьмі ўсе лаўкі ў «хаце свякрові.

На другі дзень вяселля жаніх звычайна з чырвонай гарэлкай і чырвонымі кветкамі (тут сімволіка ясная) ехаў да цешчы. Калі ж нявеста не захавала дзявочай чысціні, жаніх вёз цешчы ганебны хамут. Пасля першага дня вяселля нявесту называлі ўжо маладзіцаю, і ёй ў асноўным былі прысвечаны ўсе песні.

Многія элементы вясельнай абраднасці (яшчэ на памяці інфарматараў — жанчын 70 — 80-гадовага ўзросту) былі звязаны з культам татэмных жывёл, духаў прыроды, пакланеннем сонцу, маці-зямлі, вадзе. Сёння рэшткі некаторых магічных абрадаў захаваліся як элементы тэатралізаванай гульні.

Каб зразумець сябе сапраўдным чалавекам, уявіць прыналежнасць да свайго роднага, беларускага, славянскага, зразумець сваё месца ў сусвеце, неабходна вывучаць народныя каштоўнасці, тое, што стагоддзямі стваралі, выкарыстоўвалі і захоўвалі нашы продкі.

У. І. СЕНЬКАВЕЦ

## ГЕНЕЗІС І ПАЭТЫКА РАННІХ САНЕТАЎ ЯНКІ КУПАЛЫ

Як вядома, талент Янкі Купалы ўзрастаў на грунце двух паэтычных стыхій: літаратурнай і народна-песеннай. Гэты працэс добра назіраецца ў ранніх вершах паэта, напісаных яшчэ па-польску, у прыватнасці, у форме санета.

Сёння санет успрымаецца як чыста літаратурны жанр, але на заранку развіцця ён быў блізкім да вуснай народнай творчасці. Гэта адзначаюць многія даследчыкі. Так, па словах сучаснага польскага літаратуразнаўцы Казіміра Купіша, «істотны ўплыў на фармальную структуру першых санетаў аказалі народныя strambotti, адкуль быў пераняты санетны від рыфмы ў чатырохрадкоўях (АБАБ замест АББА)»[1]. Праўда, сувязь санета з народна-паэтычнай творчасцю аказалася пазней забытай, узаконілася форма, створаная паэтамі «dolce stil nuovo», асабліва Дантэ і Петраркам. У пачатку XIX стагоддзя сувязь санета з народнапесеннай традыцыяй аднавілі рамантыкі, для якіх наогул характэрны свабодны падыход да літаратурных жанраў.

Янка Купала на пачатку свайго літаратурнага шляху, яшчэ не ведаючы тэарэтычных прынцыпаў пабудовы класічнага санета, спрабуе засвоіць сакрэты гэтай формы на ўзорах польскіх рамантыкаў, найперш вопыту і здабыткаў А. Міцкевіча і Ю. Славацкага. Пазней Купала падкрэсліваў, што з польскіх аўтараў на яго «вялікае ўражанне аказалі Славацкі і Міцкевіч...» Любоў да гэтых паэтаў у яго захавалася на ўсё жыццё. Вядома, напрыклад, што ў канцы 1940 — пачатку 1941 года ён многа і рупліва працаваў над перакладамі крымскіх санетаў А. Міцкевіча, якія, на жаль, загінулі ў Мінску ў пачатку вайны. Відавочна, што знаёмства Купалы з польскай літаратурай дало яму штуршок для напісання твораў на польскай мове. Санетныя спробы — выразнае таму сведчанне.

У адных купалавых санетах адчуваецца імкненне паэта захаваць гучнасць, стройнасць вершаванага радка А. Міцкевіча, у другіх — перавага аддаецца страфічнай раскаванасці санетных формаў Ю. Славацкага. Напрыклад, уласцівая А. Міцкевічу санетная рыфмоўка італьянскага тыпу АББА АББА (АБАБ АБАБ) СДС ДСД пераважае і ў купалавых санетах: у А. Міцкевіча — з адэскіх: санеты I—III, VI, IX, X, XIII, XVI, XVIII—XX; з крымскіх: I, V—XI; у Я. Купалы: «Przestancie marzyc». «O zmroku».

Чытаючы Ю. Славацкага, Я. Купала заўважыў, што тут рыфмоўка адрозная ад міцкевічавай: Славацкі часта адступаў ад кананічнага правіла нязменнасці катрэннай формы (Kiedy sies w niebic gdzie zejdziemy sami...— abba acca), дапускаў самыя розныя варыяцыі тэрцэтнай рыф-